Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Вучэбна-педагагічны комплекс
Асінаўшчызненскі-яслі-сад – пачатковая школа”

Канспект урока
па вучэбнаму прадмету “Выяўленчае мастацтва”
3 клас

Паржон Н.М., настаўнік
пачатковых класаў,
адукацыя вышэйшая,
першая кваліфікацыйная

катэгорыя

**Тэма:** Жывёлы на арэне цырка. Лепка.
**Мэта:** плануецца, што да канца ўрока вучні навучацца састаўляць калектыўную сюжэтную кампазіцыю з аб’ёмных аб’ектаў.
**Задачы:** актуалізацыя ўяўлення пра перадачу асноўных прапорцый і характэрных поз пры аб’ёмнай лепцы жывёл, удасканаленне навыкаў лепкі камбінаваным спосабам, удасканаленне навыкаў паэтапнага выканання аб’ёмнай скульптурнай кампазіцыі, развіццё вобразнага мыслення, мелкай маторыкі рук, выхаванне цікавасці да работы з пластылінам, творчай актыўнасці і любові да жывёл.
**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік, ілюстрацыі на тэму “Цырк”, “Заапарк”, пластылін, стэкі, кардон, дошчачка для лепкі, сурвэтка.

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны момант.**

Стварэнне псіхалагічнага настрою на добрую працу. Практыкаванне “Далонькі” (Я жадаю табе …).

**2. Актуалізацыя ведаў. Падыход да тэмы ўрока.**

Разгадванне крыжаванкі (сетка крыжаванкі на дошцы).

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **ж** | | | | | ы | в | а | п | і | с |
| | | п | р | **ы** | р | о | д | а | | |
| | а | л | о | **в** | а | к | | | | |
| | в | я | с | **ё** | л | к | а | | | |
| | | п | а | **л** | і | т | р | а | | |
| ф | а | р | б | **ы** | | | | | | |

1. Від выяўленчага мастацтва, заснаваны на ўменні маляваць прадметы фарбамі. (Жывапіс).
2. Што часцей за ўсё адлюстроўвае мастак у пейзажы? (Прыроду).
3. Прылада, якой часцей за ўсё карыстаецца мастак-графік. Бывае мяккі, цвёрды, каляровы, просты.(Аловак).
4. Рознакаляровая палоска на небе. (Вясёлка).
5. Дошчачка для змешвання фарбаў. (Палітра).
6. Закончы сказ. Тэмперныя, алейныя, акварэльныя, гуашавыя гэта … (фарбы).

Якое слова атрымалася ў слупочку пад № 1? (Жывёлы).

Дзе можна сустрэць жывёл? (Адказы вучняў). Так, жывёлы ёсць усюды: у лесе, на полі, на лузе, на балоце, у нас дома, а яшчэ ў цырку і ў заапарку.
Як вы думаеце, якім жывёлам лепш жывецца?
Хто з вас быў у цырку? У заапарку? (Выказванні дзяцей, разглядванне ілюстрацый).

А ці ведаеце вы, што такое “Мядзведжая акадэмія? (Выступленне загадзя падрыхтаванага вучня).

Заснавалі мядзведжую акадэмію ў XVII стагоддзі князі Радзівілы ў Смаргоні. Маленькіх мядзведзяў змяшчалі ў клеткі, пад якімі палілася вогнішча. Падлога награвалася, мядзведзі вымушаны былі падымаць пярэднія лапы, а на задніх як бы падтанцоўваць. У той час раздаваліся гукі бубнаў ці скрыпкі. Навука доўжылася месяцамі. Так навучаныя мядзведзі пачыналі танцаваць пад знаёмую мелодыю ўжо без гарачай падлогі. Нездарма на гербе Смаргоні намаляваны чорны мядзведзь: заднімі лапамі ён стаіць на чырвонай рашотцы, а ў пярэдніх трымае радаводны герб Радзівілаў. У гарадскім парку размясцілі скульптурную кампазіцыю з чыгуну – «Мядзведжая акадэмія».

**3. Пастаноўка тэмы і мэты ўрока.**

Разгадаўшы крыжаванку і паглядзеўшы на падрыхтаваныя да ўрока прылады працы, вучні здагадваюцца, што тэма ўрока – лепка жывёл. Настаўнік удакладняе “Жывёлы на арэне цырка. Лепка.” Па апорных словах вучні фармулююць мэты ўрока.

*Успомнім:*
тэхніку бяспекі на рабочым месцы пры рабоце з пластылінам,
асноўныя спосабы лепкі жывёл.

*Будзем вучыцца:*
ляпіць камбінаваным спосабам жывёл у руху,
працаваць спачатку самастойна, а потым састаўляць калектыўную скульптурную кампазіцыю,
атрымліваць задавальненне ад працы.

**4. Вывучэнне новай тэмы.**

Вы ўсе цяпер скульптары. Ваша задача – стварыць фігуркі жывёл – артыстаў цырка. Кожны можа ўявіць сябе ў ролі дрэсіроўшчыка і выбраць тую жывёлу, якую б хацелася бачыць на арэне. Давайце больш падрабязна разглядзім этапы лепкі на прыкладах, якія прыведзены ў падручніку.

**Работа з вучэбным дапаможнікам.** (с. 114-116, 119-121)

Настаўнік звяртае ўвагу дзяцей на прапорцыі цела жывёл і характар яго рухаў (сядзіць, стаіць, ляжыць, танцуе і інш.)

**5. Фізкультхвілінка “Вось так”.**

**6. Самастойная работа навучэнцаў.**

**Інструктаж па тэхніцы бяспекі пры рабоце з пластылінам.**

**Творчая дзейнасць.**

У час працы настаўнік абыходзіць клас, дае патрэбныя заўвагі, дапамагае. Калі сустракаюцца тыповыя памылкі, спыняе работу і дае дадатковыя

тлумачэнні.

Ціха гучыць спакойная музыка.

У канцы ўрока дзеці састаўляюць калектыўную сюжэтную кампазіцыю на зробленай з кардона арэне.

7. **Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія. Аналіз работ.**

Якія спосабы лепкі з пластыліна вы выкарыстоўвалі сёння на ўроку? (састаўленне з асобных частак, выцягванне дэталей з цэлага кавалка).

Як называецца прафесія чалавека, які стварае аб'ёмныя творы мастацтва? (Скульптар).

Хто дрэсіруе жывёл у цырку? (Дрэсіроўшчык).

Паглядзіце, якія цудоўныя атрымаліся вашы работы. Дзеці, як гледачы ў цырку паказваюць, што нумар ім спадабаўся? (Апладзіруюць). А калі вы не задаволены, то можна патопаць.

Калі ўрок вам спадабаўся, вы навучыліся ляпіць жывёл, то паапладзіруйце сабе. Калі вы нічога не зразумелі і лічыце, што дарэмна патрацілі час, – патопайце. Хто лічыць, што вам не хапіла часу, пагладзьце сябе па галаве і скажыце: "Не сумуй, дружок, у наступны раз абавязкова паспееш".

Малайцы! Дзякую за працу.